УДК 61:615.1(043.2)
ББК 5:52.82
ISBN 978-985-21-0251-3


*Кугаева К. С.*

# ДАКТЫЛЬНАЯ І ЖЭСТАВАЯ МОВА ЯК СРОДАК ЗНОСІН

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Ратынская Н. В***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Жэсты вельмі часта (калі не заўседы) прымаюць удзел у непасрэдных міжасобасных зносінах, складаючы іх важны невербальны кампанент. Выкарыстоўваюцца яны па-рознаму ў залежнасці ад мэты і абставін.

Выказванне гутарковай мовы з`яўляецца вынікам узаемадзеяння вербальных і невербальных кампанентаў, пры гэтым жэставая мова значна дапаўняе вербальную сістэму камунікацый.

Існуюць самастойныя невербальныя сістэмы зносін, якія могуць мець вузкія камунікатыўныя функцыі (жэсты, якія выкарыстоўваюцца ў арміі, у спорце, на транспарце) і больш універсальныя па прызначэнні і складаныя па будове жэставыя сістэмы (сістэмы зносін некаторых пляменаў аўстралійцаў, членаў манаскіх ордэнаў і, канечне, дактыльная і жэставая мова глухіх).

Дактыльная і жэставая мова глухіх – гэта асаблівая сістэма, у якой жэсты абазначаюць не самі з`явы навакольнага свету, а літары алфавітаў нацыянальных моў. Функцыі дактыльнай мовы даволі шырокія: дактылалогія выкарыстоўваецца пры зносінах тых, хто чуе, і глухіх (настаўнікаў, бацькоў і інш.), а таксама прымае ўдзел у міжасобаснай камунікацыі глухіх, якая ажыццяўляецца галоўным чынам пры дапамозе жэставай мовы.

Дадзеная праца мае на мэце больш ясна прадставіць спецыфіку структуры і функцыянавання дактыльнай і жэставай мовы, кожная з якіх з’яўляецца разнавіднасцю рухальнай і кінетычнай камунікацыі чалавецтва.

Разгледзеўшы асаблівасці розных жэставых сістэм, можна зрабіць выснову, што галоўнае падабенства сістэм – гэта спосаб перадачы і ўспрымання інфармацыі, а асноўнай сэнсавай адзінкай з’яўляецца жэст-кінетычны акт, у якім, у першую чаргу, прымаюць удзел рукі.

Репозиторий БГМУ